БЕЛАРУСКАЯ МОВА

В. В. Седлавец, Н. Г. Хадасевіч

# ЗБОРНІК ПРАКТЫКАВАННЯЎ

## Павышэнне пісьменнасці і цікавасці да вывучэння мовы

**7 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў
установ агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай
і рускай мовамі навучання

М а з ы р
«Выснова»
2 0 2 0

# Прадмова

Дапаможнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з праграмай і можа быць выкарыстаны для індывідуальнай і калектыўнай працы з вучнямі. Змешчаныя практыкаванні маюць на мэце дапоўніць, паглыбіць, пашырыць практычную частку падручніка. Яны могуць быць выкарыстаны на ўсіх этапах урока: пры тлумачэнні новага матэрыялу, яго замацаванні і абагульненні.

Па кожнай тэме прапаноўваюцца разнастайныя віды практыкаванняў, якія накіраваны не толькі на асэнсаванне правіл і іх прымяненне, але і на развіццё моўнай культуры вучняў.

Складальнікі імкнуліся, каб заданні да практыкаванняў і самі практыкаванні падштурхоўвалі вучняў весці актыўныя назіранні над мовай, рабіць аналіз моўных з’яў, параўноўваць, супастаўляць, рабіць вывады, сістэматычна паўтараць вывучаны матэрыял.

# ВАЛОДАННЕ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВАЙ — АСНОЎНЫ ПАКАЗЧЫК КУЛЬТУРЫ ЧАЛАВЕКА

**1.** Спішыце тэкст, устаўляючы ў яго народныя вітанні і зычэнні.

### ВІТАННІ І ЗЫЧЭННІ

Сярод беларускіх народных выслоўяў шмат вітанняў з добрымі зычэннямі людзям, якія працуюць у хаце, на полі, на агародзе, на двары, на таку. У час працы зычылі спору, плёну. Сейбіту — ..., агародніцы — ...; жнейцы — ...; ткаллі — ...; рыбаку — ... . Гаспадыні, што рашчыняе хлеб, — ...; доіць карову — ...; збівае масла — ...; пячэ бліны — ... . У гэтых ветлівых і сардэчных зваротах-зычэннях выяўлена вялікая павага да працы і да працоўнага чалавека.

Вядомы шматлікія добрыя пажаданні пры розных іншых акалічнасцях. Пры зборах у дарогу — ...; на наваселлі — ...; у лазні — ...; пры чханні — ...; пры наведванні хворага — ... .

**Для даведкі:**

«Поўны сеці!»
«Шоўкавы венік, лёгкі дух!»
«Багата на ўток!»
«Падходна вам!»
«Малочна вам!»
«Радзі, божа, на камені і пад каменем!»
«З вядро качаны!»
«Скачком бліны!»
«Комам масла!»
«Будзь здаровы на ўвесь год, як калядны лёд!»

«Каб з аднаго каласочка было паўрашаточка, а з аднаго снапочка была цэла бочка!»

«Гладкае вам дарожкі!»

«Бадай табе палепшала!»

«Гэтай будынкі на пастаянне, а вам на пражыванне!»

**2.** Устанавіце адпаведнасць паміж народнымі выслоўямі (пажаданнямі спору, плёну ў працы) і іх адрасатам. Якія пачуцці выяўляюцца ў гэтых пажаданнях?

а) Рыбна вам!
б) Багата на ўток!
в) Малочна вам!
г) З вядро качаны!
д) Падходна вам!
е) Скачком бліны!
ж) Комам масла!
з) Радзі, божа, на камені і пад каменем!
і) Каб з аднаго каласочка было паўрашаточка, а з аднаго снапочка была цэла бочка!

1) агародніца
2) сейбіт
3) ткачыха
4) жняя
5) рыбак
6) гаспадыня, якая збівае масла
7) гаспадыня, якая пячэ бліны
8) гаспадыня, якая доіць карову
9) гаспадыня, якая рашчыняе хлеб

**3.** Перакладзіце словы на беларускую мову, пастаўце націскі.

Везти, верба, валенок, вчера, доска, знахарь, ласковый, некоторый, обруч, окунь, апостроф, плести, поровну, старый, шестьдесят.

**4.** Запішыце словы ў транскрыпцыі.

Абвязка, пясчаны, у лодцы, ледзьве, з дзвярэй, счысціць, з жыцця, без шуму, белгарадскі, адчэпішся, пругкасць, малацьба, раскісленне, перакладчык, пераплётчык, снедаць, не быў, лічба.

# Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Валочка, Г. М.* Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. 10—11 кл. : вучэб.-метад. комплекс / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, І. Л. Бурак. — Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2010. — (Беларуская мова. Факультатыўныя заняткі).

2. *Гіруцкая, Л. А.* Беларуская мова: заданні, практыкаванні, тэсты : дапам. для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену / Л. А. Гіруцкая, А. П. Сахончык. — Мінск: Тетралит, 2014.

3. *Зелянко, В. У.* Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10—11 класы : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Зелянко. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

4. *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. — Мінск: «Бел. Асац. «Конкурс», 2006.

5. *Саматыга, Ю. У.* Вучэбныя модулі па беларускай мове: арфаграфія і марфалогія : практ. для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / Ю. У. Саматыга. — Мазыр: Белы Вецер, 2014.

6. *Якуба, С. М.* Сакрэты словазмянення і словаўтварэння: 6 клас : вучэб.-метад. комплекс / С. М. Якуба. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. — (Беларуская мова. Факультатыўныя заняткі).

# Змест

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

ВАЛОДАННЕ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВАЙ — АСНОЎНЫ ПАКАЗЧЫК КУЛЬТУРЫ ЧАЛАВЕКА . . . . . . . . . . 4

ТЭКСТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў 5—6 КЛАСАХ . . . . . . . . 11

СТЫЛІ МАЎЛЕННЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

ДЗЕЯСЛОЎ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

ДЗЕЕПРЫМЕТНІК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

ПРЫСЛОЎЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

СЛУЖБОВЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ І ВЫКЛІЧНІК . . . . . . 42

ПРЫНАЗОЎНІК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44

ЗЛУЧНІК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

ЧАСЦІЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51

ВЫКЛІЧНІК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

ПЕРАХОД З АДНОЙ ЧАСЦІНЫ МОВЫ Ў ІНШУЮ . . . . . . 58

ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

Спіс выкарыстанай літаратуры . . . . . . . . . . . . . . 62